# Весці

## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс. Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 2 (40) 2004**

Серыя 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія

*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
В. А. Бондар
*(нам. галоўнага рэдактара)*
В. В. Бушчык
Ю. А. Быкадораў
*(нам. галоўнага рэдактара)*
М. С. Вайтовіч
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Л. М. Давыдзенка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
П. В. Кікель
Н. І. Копысава
*(адказны сакратар)*
Г. А. Космач
А. М. Люты
І. А. Новік
А. У. Рагуля
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
М. Т. Стэльмашук
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. Г. Ясавееў
М. С. Яўневіч

## Змест

### *Гісторыя*

**Да 60-годдзя вызвалення Беларусі**

*Караткевіч А. Ц.* Навечна ў памяці народнай .......... 3

*Каваленя А. А.* Аперацыя «Баграцiён» .......... 5

*Валчок Г. І.* Узаемадзеянне партызан Магілёўскай вобласці з часцямі Чырвонай арміі ў ходзе беларускай наступальнай аперацыі... 7

*Канапацкі І. Б., Шкуцько Л. Л.* Садружнасць народаў СССР у перыяд вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў .... 10

*Кузьменка У. І.* Інтэлігенцыя ў антыфашысцкай арганізацыйнай і палітычнай рабоце ў перыяд вызвалення Беларусі .......... 11

*Жылінскі М. Г.* Арганізацыя і праца савецкіх школ на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.......... 15

✧ ✧ ✧

*Мацюш П. А.* Навуковыя і навукова-педагагічныя кадры гісторыкаў Беларусі: дынаміка колькаснага росту ў 60 — пачатку 70-х гг. XX ст. .......... 21

*Пілецкі В. А.* «Гамераўскія» мужчынскія саюзы як адзін з элементаў фарміравання выхаваўча-адукацыйнага працэсу эпохі антычнасці .......... 23

*Лапановіч С. Ф.* Дзейнасць Тацццянінскага камітэта па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.......... 26

*Фядковіч Г. І.* Дзейнасць балгарскіх інтэрнацыяналістаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайне .......... 29

*Сямёнава С. А.* Роля купецтва ў развіцці гандлю, прамысловасці і фінансаў Беларусі ў другой палове XVIII — першай палове XIX ст...... 31

*Крывуць В. І.* Удзел Войска Польскага ў рэалізацыі ўрадавай маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 30-х гг. XX ст. .......... 35

*Важнік В. М.* Беларуска-польскае эканамічнае і гандлёвае супрацоўніцтва ў 50—70-х гг. XX ст. .......... 38

### *Філасофія*

*Кікель П. В., Маркіянава Н. П.* Выхаванне як аснова станаўлення будучага спецыяліста .......... 42

*Біхарж Р. І.* Функцыі метадалагічных ведаў у навуковым даследаванні .......... 45

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЭКАНОМІКА

УДК 338.242

***В. Ф. Губарэвіч***

## РЫНКАВАЯ ЭКАНОМІКА І ДЗЯРЖАЎНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ

З распадам Савецкага Саюза і набыццём незалежнасці былыя савецкія рэспублікі праводзілі рэфармаванне сваіх эканамічных сістэм шляхам прыняцця рашэнняў, часткова абгрунтаваных і выверaных, а часам, асабліва ў пачатку пераходнага перыяду, недастаткова збалансаваных, непаслядоўных і неэфектыўных. У выніку ў многіх з іх, у тым ліку ў Рэспубліцы Беларусь, працэс пераўтварэння эканомік носіць далёка не завершаны характар, краіна да гэтага часу знаходзіцца на раздарожжы — ісці па шляху стварэння і развіцця неабходных элементаў эканомікі рынкавага тыпу ці вярнуцца назад да мадэлі планавай сацыялістычнай гаспадаркі.

Пакуль выбару ў нас няма — сусветны вопыт паказаў, што краіны, якія развіваюцца па рынкавым шляху, дабіваюцца значна лепшых эканамічных рэзультатаў, маюць больш высокі ўзровень прадукцыйнасці працы і ўзровень жыцця асноўнай часткі насельніцтва [4, с. 84—97]. Пытанне для нас толькі ў выбары правільнай траекторыі шляху, тэрмінаў, тэмпаў, этапаў такога пераходу.

Уласны вопыт допушчаных памылак у нашай краіне, у бліжэйшых суседзяў, а таксама сусветны вопыт даюць багатую глебу для абдумвання ўжо пройдзенага шляху ў справе рэалізацыі рэформ і выпрацоўкі адэкватных стратэгічных і тактычных рашэнняў. Варта адзначыць, што пры пабудове карэнных элементаў новай эканамічнай сістэмы нельга дапусціць датэрмінова адказу ад выкарыстання рэгулюючых элементаў папярэдняй сістэмы, у адваротным выпадку можа аказацца, што ў нейкі перыяд часу адны рэгулюючыя нормы *ўжо* не дзейнічаюць, а іншыя — *яшчэ* не дзейнічаюць з усімі выцякаючымі адсюль негатыўнымі наступствамі.

У выніку неабходна пабудаваць такое эканамічнае асяроддзе, у якім суб'екты гаспадарання могуць самастойна прымаць і рэалізаваць найбольш эфектыўныя рашэнні ва ўмовах глабалізацыі эканомікі і паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, ствараючы тым самым эканамічны базіс для ўстойлівага развіцця эканомікі і росту якасці жыцця дадзенай краіны.

Пры гэтым неабходна памятаць, што новая інстытуцыянальная мадэль эканомікі павінна абапірацца ў тым ліку на такія неэканамічныя элементы, як нацыянальныя традыцыі, нацыянальная культура, права, псіхалогія, этыка, мараль, гэта значыць нефармальныя інстытуты грамадства.

Практычна ва ўсіх краінах з пераходнай эканомікай на практыцы меў месца недастатковы ўлік інстытуцыянальнага фактару, асабліва на першых этапах рынкавых пераўтварэнняў, што ў сваю чаргу негатыўна сказалася на эфектыўнасці эканамічных працэсаў у гэтых краінах. Лібералізацыя ўнутранага рынку, у першую чаргу цэнаўтварэння, а таксама лібералізацыя знешняй эканамічнай дзейнасці не прынеслі жаданага поспеху ў сілу таго, што пры іх увядзенні яшчэ не была гатова інстытуцыянальная структура рынкавага тыпу, якая была б у стане адэкватна ўспрыняць рынкавыя імпульсы і змяніць сістэму органаў цэнтралізаванага планавага кіравання. Фактычна ў большасці краін утварыўся так званы «інстытуцыянальны вакуум», у рэзультаце якога суб'екты гаспадарання дэзарыентаваны, а адсутнасць заканадаўчых абмежаванняў прывяла ў большасці постсацыялістычных краін да развіцця антыграмадскіх форм прысваення, да недобрасумленнай канкурэнцыі, росту неплацяжоў, карупцыі, крыміналізацыі эканомікі і іншых негатыўных працэсаў. Варта прызнаць, што лібералізацыя, якая суправаджалася цэлым шэрагам негатыўных працэсаў, у той жа час дазволіла ўраўнаважыць рынак і прымусіла больш актыўна фарміраваць новае інстытуцыянальнае асяроддзе.

Трэба адзначыць, што на працэс рэформ у постсацыялістычных краінах вялікі ўплыў аказала праблема сумяшчальнасці фармальных і нефармальных інстытутаў. Калі фармальныя (пісаныя) правілы змяняюцца ў выніку прыняцця адпаведных законаў, загадаў, пастаноў, то нефармальныя нормы маралі, традыцыі, звычаі, грамадская думка і інш. не замацаваны ў фармальных заканадаўчых актах. Яны фармі-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГТУ

раваліся на працягу доўгага часу і хутка змяніць іх няпроста.

Постсацыялістычныя краіны да пачатку рынкавых рэформ мелі розны ўзровень набліжанасці фармальных і нефармальных інстытутаў да рынкавых прынцыпаў функцыяніравання. Таму іх эканомікі па-рознаму рэагавалі на лібералізацыю эканамічных адносін і пераход да манетарысцкіх метадаў рэгулявання эканомікі. Менавіта большая адпаведнасць рынкавым адносінам фармальных і нефармальных інстытутаў краін Цэнтральнай Еўропы (і ў нейкай ступені прыбалтыйскіх дзяржаў) у параўнанні з краінамі Усходняй Еўропы пазбавіла іх ад многіх складанасцей пры пераходзе да рынкавай эканомікі.

У нейкай ступені гэтымі прычынамі тлумачацца і тыя працэсы, што адбываліся ў Рэспубліцы Беларусь. Асноўны спад у эканоміцы прыйшоўся на 1992—1995 гг., калі дастаткова хутка дэманціравалася сістэма цэнтралізаванага планавання і кіравання і пачалося паскоранае ўваходжанне ў рынак. У той жа час адпаведных моцных інстытутаў рынкавай і адначасова суверэннай дзяржавы створана не было, а нефармальныя інстытуты, па сутнасці, былі прасацыялістычнымі і нярынкавымі.

З 1994 г., пасля выбараў першага прэзідэнта краіны, пачаўся этап умацавання дзяржаўных інстытутаў пры адначасовым рэзкім запавольванні працэсаў лібералізацыі эканомікі. З 1996 г. у эканоміцы пачаўся хуткі эканамічны рост, што тлумачылася грашовай экспансіяй. Эканамічны ўздым толькі ў малой ступені тлумачыўся працэсамі станаўлення і развіцця рынкавых інстытутаў, у асноўным ён быў дасягнуты за кошт узнаўлення цэнтралізаванага кіравання і абмежавання прадпрымальніцкіх свабод, у першую чаргу ў сферы цэнаўтварэння. Дадзены падыход у нейкай ступені быў апраўданы ў той канкрэтны гістарычны перыяд, паколькі не было дапушчана поўнай дэградацыі эканомікі. Аднак у апошні час ён ужо істотна тармозіць эканамічны прагрэс.

Відавочна, што сёння краіне неабходна вярнуцца ў русла рынкавых рэформ. Для гэтага ў Рэспубліцы Беларусь існуюць пэўныя прадпасылкі — стала больш дасканалай нарматыўна-прававая база, лепш развіты арганізацыйныя структуры рынкавага тыпу, назапашаны пэўны вопыт, істотна змяніліся нефармальныя інстытуты, насельніцтва ў большай ступені стала падтрымліваць рынкавыя рэформы.

Варта адзначыць, што ў рашэнні праблемы фарміравання і функцыяніравання рынку важнейшая роля належыць дзяржаве. Яна, з'яўляючыся асноўным уладным інстытутам, адначасова заклікана ажыццяўляць рэфармаванне ўсёй сістэмы. Збоі ў функцыяніраванні рынкавай сістэмы могуць ліквідавацца па-рознаму. Па-першае, самі суб'екты гаспадарання ствараюць фармальныя або нефармальныя інстытуты, здольныя змяніць сітуацыю да лепшага. Па-другое, дзяржаўныя органы могуць прыняць адпаведныя меры на дзяржаўным узроўні. Аднак у любым выпадку дзяржава прызвана сачыць, каб рашэнне якой-небудзь прыватнай праблемы не ўступала ў супярэчнасць з функцыяніраваннем цэласнай інстытуцыянальнай сістэмы і ў неабходных выпадках своечасова прымаць адпаведныя меры.

Такім чынам, рынкавыя пераўтварэнні эканомікі маюць на ўвазе ўзмацненне ролі дзяржавы. У пераходнай эканоміцы з'яўляецца неабходнасць з боку дзяржавы аказваць падтрымку патэнцыяльна эфектыўным, але не сумеўшым прыстасавацца да новага, яшчэ не дасканалага канкурэнтнага асяроддзя, прадпрыемствам, а таксама забяспечыць сацыяльную абарону тых груп насельніцтва, чыё эканамічнай становішча можа значна пагоршыцца пры правядзенні рынкавых рэформ. Можна канстатаваць, што дзяржава можа ажыццяўляць сваё рэгуляванне *там і пастолькі, дзе і паколькі* рынкавая самарэгуляцыя немагчыма або неэфектыўна.

У гэтых умовах істотна ўзрастаюць патрабаванні да эфектыўнасці функцыяніравання дзяржаўных структур, кваліфікацыі і маральных якасцей работнікаў апарату. Іх галоўная задача — своечасова выяўляць праблемныя пытанні і прымаць эфектыўныя рашэнні ў рамках агульнай стратэгіі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Найбольш небяспечнай з'явай з пункту гледжання нармальнага функцыяніравання ўсёй сістэмы дзяржаўнага кіравання з'яўляецца карупцыя. Яна разбурае знутры сістэму кіравання дзяржавай, дэмаралізуе насельніцтва, параджае ў масавай свядомасці перакананні аб усясільнасці адміністрацыйна-кіраўнічага апарату і ўседазволенасці з яго боку, што падрывае асновы дзяржаўнай улады.

Аб маштабах карупцыі ў рэспубліцы можна меркаваць па выніках апытання работнікаў праваахоўных органаў, якія непасрэдна займаюцца пытаннямі барацьбы з гэтай з'явай. З ліку апытаных 10,2 % указалі на вельмі вялікую ступень распаўсюджвання карупцыі, 40,9 % — вялікую і 35,4 % — сярэднюю [3, с. 42]. На думку работнікаў праваахоўных органаў, у большай ступені карумпіраваны дзяржаўныя структуры, надзеленыя ўладнымі паўнамоцтвамі па рашэнні пытанняў у сферы эканомікі і фінансаў, а таксама праваахоўныя і кантралюючыя органы. Прычым у найбольшай ступені карумпіраваны кіруючыя работнікі названых структур

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(даныя супадаюць з рэзультатамі апытання прадпрымальнікаў).

Сярод пытанняў, пры рашэнні якіх ажыццяўляліся акты карупцыі, адзначаліся выдача крэдытыў (62,5 %), ліцэнзій (60,3 %), незаконны пропуск праз граніцу рэчаў і тавараў (59,7 %), непрыняцце мер па прыцягненні да крымінальнай (46,2 %) або адміністрацыйнай адказнасці (43,4 %), вызваленне ад крымінальнай адказнасці (43,1 %), пратэжыравання ў органах дзяржаўнай улады (37,2 %) і інш. [3, с. 42]. Прыведзеныя даныя сведчаць аб тым, што барацьба з карупцыяй у рэспубліцы застаецца актуальнай практычна на ўзрозні ўсіх уладных структур і для гэтага патрабуюцца значныя намаганні.

У працэсе рэфармавання эканомікі поспех у многім залежыць ад таго, наколькі дакладна і пэўна сфармуліраваны мэты. Пры гэтым трэба ўлічваць наступнае:

— у якасці мэты павінен выступаць не сам працэс рэформ, а ўспрымаемы народам рэзультат;
— змест рынкавых пераўтварэнняў павінен быць прама ўвязаны з задачай забеспячэння ўстойлівага росту дабрабыту народа, гэта значыць сацыяльныя патрэбнасці павінны выступаць арганічнай мэтай рэформ;
— важна, каб у адносінах да галоўных мэт рэформ у грамадстве былі дасягнуты згода і разуменне, таму правядзенне рынкавых рэформ павінна суправаджацца пастаяннай мэтанакіраванай тлумачальнай работай для ўсіх слаёў насельніцтва рэспублікі;
— рынкавыя пераўтварэнні павінны ацэньвацца не з пункту гледжання атрымання імгненны выгод, а зыходзячы з неабходнасці дасягнення стратэгічных мэт.

Пры фарміраванні прыярытэтаў эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь неабходна зыходзіць з яе асаблівасцей як малой краіны з адкрытай эканомікай, падвергнутай уплыву сусветных эканамічных працэсаў, нацыянальных духоўных і культурных традыцый народа, выгаднага геаграфічнага становішча, асаблівасцей прыродна-кліматычных умоў, наяўнасці параўнальна небагатай мінеральна-сыравіннай базы, рэальнага стану некалі перадавой, а ў сучасны момант у значнай ступені застарэлай матэрыяльна-тэхнічнай базы галін народнай гаспадаркі, працоўнага патэнцыялу і ўзроўню кваліфікацыі працуючых, дастаткова высокага навукова-тэхнічнага патэнцыялу. Аналіз зыходных прадпасылак паказвае, што прыярытэтным для нашай краіны павінна стаць экспартная арыентацыя, заснаваная на больш поўным выкарыстанні і развіцці тых канкрэтных пераваг і абмежаваных рэсурсаў, якімі яна валодае. У нашай краіне мэтазгодна прыдаць прыярытэтнае развіццё наступным галінам нацыянальнай эканомікі:

— навукоёмкім, уключаючы машынабудаванне — за кошт значнага навукова-тэхнічнага патэнцыялу;
— хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці — за кошт наяўнасці запасаў, у першую чаргу калійных солей і праходжання праз краіну магістральных нафта- і газапровадаў;
— лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці — за кошт наяўнасці значных запасаў лесу;
— вырошчванню і перапрацоўцы льну і бульбы — за кошт спрыяльных умоў іх вырошчвання;
— транспартным і камунікацыйным паслугам — за кошт выкарыстання спрыяльнага месцазнаходжання рэспублікі для арганізацыі транзіту праз яе тэрыторыю.

Забяспечыўшы прыярытэтнае развіццё дадзеных і ўзаемазвязаных галін, Беларусь можа стварыць базу для ўстойлівага эканамічнага росту і павышэння ўзроўню дабрабыту народа. Развіццё астатніх галін павінна дыктавацца патрабаваннямі эканамічнай бяспекі, а таксама рухомасцю рынкавых сіл, забяспечваючых свабодны пераліў капіталу ў найбольш прыбытковыя галіны.

Пры характарыстыцы ўзаемадзеяння дзяржавы і рынку трэба зыходзіць з таго, што сучаснай дзяржаве належыць знаходзіцца не па-за рынкам, не пад рынкам, яна павінна быць арганічна ўбудавана ў сістэму рынкавых сувязей у якасці раўнапраўнага суб'екта, а дакладней сказаць, у якасці аднаго з суб'ектаў рынку. Гэта палажэнне даволі своеасаблівае. Так, для Беларусі, якая мае самы вялікі працэнт дзяржаўнай уласнасці сярод рэфармуемых краін, пры выбары форм, метадаў і тэрмінаў правядзення непазбежных працэсаў пераўтварэння дзяржуласнасці ў сучасны момант мэтазгодна дзяржаўная падтрымка не проста хуткай прыватызацыі, а такой прыватызацыі, пры якой будзе знойдзены стратэгічны ўласнік, здольны эфектыўна гаспадарыць пасля атрымання права ўласнасці на дадзены аб'ект, асабліва буйны. У першую чаргу дадзеная праблема надзвычай непрыймальна для так званых горадаўтвараючых прадпрыемстваў, у вялікай колькасці дастаўшыхся нам у спадчыну з сацыялістычных часоў, з іх сацыяльнымі і культурнымі сферамі, непасрэдна звязанымі на такім горадаўтвараючым аб'екце, які цалкам і поўнасцю залежыць ад іх. Рашэнне тут складанае, не можа быць адзіным для ўсіх выпадкаў. Яно ў многім вызначаецца канкрэтнымі ўмовамі ў кожным такім населеным пункце рэспублікі, але выбар шляхоў яго вырашэння застаецца за дзяржавай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У заключэнне зробім вывад, што дзяржава ў канкрэтных умовах нашай краіны не можа і не павінна поўнасцю адыходзіць з эканомікі, але яе функцыі павінны кардынальна мяняцца. Стратэгічная мэта дзяржавы ў пераходны перыяд заключаецца ў тым, каб садзейнічаць фарміраванню новых эканамічных адносін [2, с. 31]. Гэта падтрымка працэсаў стварэння і функцыяніравання суб'ектаў прыватнага прадпрымальніцтва, пераўтварэння дзяржаўных прадпрыемстваў, распрацоўка і падтрыманне правіл гульні на рынках і г. д. У гэтай сувязі выключна важным уяўляецца кантроль з боку дзяржавы за выкананнем гаспадарчымі суб'ектамі заканадаўча замацаваных стабільных правіл гульні на рынках не толькі прадукцыі, але і грошай, працы, капіталу.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Государственное регулирование рыночной экономики: Учеб. для вузов / Под общ. ред. В. И. Кушлина, Н. А. Волгина. М., 2000.
2. *Губаревич О. Ф.* Государственное регулирование рыночной экономики: Учеб. пособие. Мн., 2002.
3. Беларусь: выбор пути: Национальный отчет о человеческом развитии — 2000. Мн., 2000.
4. Проблемы реформирования экономики Республики Беларусь: Сб. науч. тр. Мн., 1999.



*SUMMARY*

*Article is devoted to consideration of interrelation of state regulation and market economy in conditions of transitive systems, to which economy of Belarus now concerns also. The author considers necessity, essence, form of state regulation of market economy, features of its regulation in the transitive period.*


УДК 339(476)

**А. І. Літвінюк**

# РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ У СІСТЭМЕ СУСВЕТНАГАСПАДАРЧЫХ СУВЯЗЕЙ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

У сучаснай эканоміцы надаецца значная ўвага праблеме распрацоўкі і абгрунтавання стратэгіі эфектыўнага ўступлення Рэспублікі Беларусь у сістэму сусветнагаспадарчых сувязей.

Пашырэнне знешнеэканамічных сувязей з зарубежнымі краінамі, выкарыстанне магчымасцей узаемавыгаднага раздзялення працы з'яўляецца адной з вузлавых праблем стабілізацыі і развіцця нацыянальнай гаспадаркі на сучасным этапе.

Распачалася праца па вызначэнні напрамкаў і сродкаў паслядоўнага ўваходжання Рэспублікі Беларусь у сусветнагаспадарчыя працэсы, неабходныя для інтэнсіўнага развіцця рынкавых адносін, стварэння рэальнай сітуацыі павышэння канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі на сусветным рынку.

У сучасным глабальным свеце з раздзяленнем працы і спецыялізацыяй нацыянальных эканомік у галінах, забяспечваючых канкурэнтныя перавагі, ад умення заваяваць і ўтрымаць рынкі, гэта значыць развіваць экспарт, залежыць дабрабыт нацыі, што важна для невялікіх дзяржаў. Таму невыпадкова, што на новую пяцігодку экспарт захаваўся як адзін з прыярытэтаў беларускай дзяржавы.

Беларусь з'яўляецца малой дзяржавай з адкрытай эканомікай. У сярэднім па ўсіх краінах свету аб'ём знешнегандлёвага абароту сувастаўім з 38—39 % нацыянальнага валавога прадукту (прыкладна такі ён у Расіі). Для Беларусі гэтыя суадносіны за 1993—1996 гг. каля 130 %. Па ступені адкрытасці эканомікі рэспубліка ўваходзіць у лік сусветных лідэраў.

По долі экспарту ў ВУП Рэспубліка Беларусь знаходзіцца ў групе краін з адкрытай эканомікай. У 1996 г. удзельная вага экспарту рэспублікі ў ВУП склала 50,8 %.

Уваходжанне Рэспублікі Беларусь у сусветную эканоміку спалучаецца з неабходнасцю выбару мадэлі дадзенага працэсу, ацэнкі магчымых альтэрнатыў. Непасрэдныя формы інтэгравання могуць быць рознымі: адкрыццё нацыянальнай эканамічнай прасторы або стварэнне інтэрвенцыянісцкай эканомікі, якая базіруецца на пратэкцыянісцкай падтрымцы дзяржавы (табл. 1).

*Таблица 1*

**Класіфікацыя краін па ступені адкрытасці сусветнаму рынку[1]**

| Доля экспарту ў ВУП, % | Назва | Колькасць |
|---|---|---|
| < 10 | Краіны з адносна закрытай эканомікай | 10 |
| 10—19 | | 27 |
| 20—24 | — | 24 |
| 25—34 | Краіны з адносна адкрытай эканомікай | 32 |
| > 34 | Краіны з вельмі адкрытай эканомікай | 70 |

[1] Табліца складзена па даных зборніка «Внешняя торговля Беларуси за 2002 г.».